**Дапісваем філасофскія верлібры Максіма Танка**

1. Дзякуюы звар’яцелым
Дасягненням навукі
Усё больш ібольш знаем
Аб першых днях
Нараджэння Зямлі,
Хоць мінулі мільёнагоддзі.
І ўсё менш і менш знаем
…………

2. Каб гаварыць з зямлёй,
Я вучыўся ў касы і плуга;
Каб гаварыць з дарогай –
У калёс і кульбакі;
Ка гаварыць з лесам –
Вучыўся ў звяроў і птушак;
Каб гаварыць з агнём –
У ветра і дыма;
Каб гаварыцб з вадой –
Вучыўся ў калодзежных журавоў…
Цяпер знаю:
……………………

3. Кій,
На які ў жыцці не абапрэшся,
Нож,
Якім хлеба не адкроіш,
Кубак,
…………….
Соль,
…………..
Дружба,
…………
Слава
Без працы мазольнай, упартай,
Слова
…………………
Нічога не варты.

4. Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;
Ты – яшчэ чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;
Ты – толькі паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, -
І толькі тады становішся чалавекам,
……………….

5. Гэта была першая
Пасляваенная ноч.
Засыналі зморaныя горам
Папялішчы,
Нівы,
Хвалі рэк.
Толькі чуць было,
Паміж сабой гаварылі зоры:
- Асцерагайцеся зямлі,
На ёй - ……….

6. Я спытаў чалавека,
Які прайшоў праз агонь,
І воды,
І медныя трубы:
- Што самае цяжкое
На гэты свеце?
І ён адказаў:
- ……………

7. І радасць - ніякая не радасць, а горыч,
І песня – ніякая не песня, а скарга,
І страва – ніякая не страва. А камень,
І брага – ніякая не брага, а слёзы,
І сонца – ніякое не сонца, а крыга, -
Калі………………………….

8. Аслепшы,
Яшчэ можна з кульбакай
Дарогу дадому знайсці.
Аглухшы,
Яшчэ будзеш чуць
Скрып дзвярэй сваёй хаты.
Анямеўшы,
З сябрамі бяседу весці
Ва ўспамінах.
Толькі страціўшы……..,
Будзеш, як камень,
…………

І быць калыскай песняў;
Чалавек…………..

9. Дрэвы паміраюць,
Калі перастаюць пазнаваць
Змены года
І не адгукаюцца рэхам;
Вада – калі забывае,
Куды ёй плыць,
І нікому не спатольвае смагі;
Зямля – калі перастае
Радіць хлеб

10. Можа таму, што ў маладосці
Часта прыходзілася даношваць
Нечыя боты,
Нечую вопратку,
Якія заўсёды былі
То завялікія,
То замалыя,
Я цяпер асцерагаюся
……………….